БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПЛАТФОРМА

ФОРУМУ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

# Заява

Каардынацыйнага камітэту
Беларускай нацыянальнай платформы
Форуму грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства
ў сувязі з затрыманнямі і ператрусамі рэдакцый партала TUT.BY

Менск 18 мая 2020 году

18 мая ў Менску і рэгіёнах Беларусі супрацоўнікамі Дэпартаменту фінансавых расследаванняў Камітэту дзяржаўнага кантролю былі праведзеныя вобшукі і затрыманні рэдактараў і журналістаў менскай і рэгіянальных рэдакцыяў партала TUT.BY. Супрацоўнікі названага вышэй дзяржаўнага органу здзейснілі выманне тэхнікі і дакументаў у рэдакцыях і з прыватных кватэр рэдактараў і супрацоўнікаў. TUT.BY быў заблакаваны Міністэрствам інфармацыі. Ператрусы адбыліся ў рэдакцыях структурных падраздзяленняў TUT.BY – AV.BY, RABOTA.BY.

Дэпартаментам фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю 18 мая 2021 года ў дачыненні да службовых асоб ТАА «Тут Бай Медыя» распачата крымінальная справа па прыкметах складу злачынства, прадугледжанага часткай 2 артыкула 243 КК Рэспублікі Беларусь (ухіленне ад выплаты сум падаткаў, збораў у асабліва буйным памеры).

Удава заснавальніка партала Юрыя Зісера Юлія Чарняўская з гіпертанічным крызам знаходзіцца ў шпіталі пад канвоем.

Беларускі партал TUT.BY – найбуйнейшы інфармацыйны партал, флагман беларускай журналістыкі. Яго чытаюць і шануюць большасць карыстальнікаў Інтэрнэту ў краіне і многія за яе межамі. Рэдактары і журналісты TUT.BY на працягу ўсяго часу існавання дэманстравалі сваёй працай высокі журналісцкі прафесіяналізм.

Каардынацыйны камітэт Беларускай нацыянальнай платформы Форуму грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства патрабуе неадкладна спыніць атаку на TUT.BY, AV.BY, RABOTA.BY і рэпрэсіі супраць журналістаў і медыя ў Беларусі. Свабода СМІ павінна быць забяспечана і крымінальны пераслед спынены.

Каардынацыйны камітэт Беларускай нацыянальнай платформы
Форуму грамадзянскай Супольнасці Усходняга партнёрства.